ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

Орган Косаўскага РК КП(б) Беларусі і Выканкома Райсовета дэпутатаў працоўных.

№ 9 Аўторак, 24 Кастрычніка 1944 г.

**Сяляне і сялянкі! Дружна падтрымаем заклік украінскіх калгаснікаў, разгорнем масавую здачу хлеба ў фонд Чырвонай Арміі, прыблізім нашу канчатковую перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі!**

## МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ РАБОТА Ў ВЁСЦЫ

Нямецкія захопнікі ў перыяд акупацыі нашага раёна ўсімі спосабамі прабавалі атруціць свядомасць совецкіх людзей, збіць іх з толку. Але не гледзячы на падлейшую хітрасць гітлераўцаў, совецкія людзі засталіся вернымі сваёй радзіме. Доказ гэтаму — шырокі партызанскі рух, спыніць які не ў сілах былі фашысцкія нягоднікі.

Партызанскія атрады, якія дзейнічалі на тэрыторыі нашага раёна, не толькі бязлітасна грамілі нямчуру, але ўвесь час трымалі насельніцтва ў курсе ўсіх падзей. Партызаны і падпольныя антыфашысцкія арганізацыі вялі вялікую растлумачальную работу сярод насельніцтва, усяляючы ў людзей веру ў хуткае вызваленне.

Зараз, калі мы прыступілі да вялікай аднаўленчай працы, мы павінны яшчэ шырэй разгарнуць масава-палітычную работу на вёсцы. Нашы людзі, выратаваныя ад няволі і гітлераўскага рабства, павінны ведаць усю праўду аб нямецкай разбойніцкай палітыцы заняволення і знішчэння народаў СССР, каб яшчэ больш ненавідзіць ворага. Абавязак партыйных, комсамольскіх і совецкіх арганізацый — нястомна паднімаць палітычную актыўнасць працоўных, павышаць іх рэвалюцыйную пільнасць, своечасова ўскрываць і прысякаць падрыўную дзейнасць варожай агентуры і распаўсюджваемыя ёю ілжывыя, правакацыйныя чуткі. Пільнасць і яшчэ раз пільнасць — жалезны закон ваеннага часу.

Палітычная работа павінна быць падпачалена канкрэтным мэтам. Асабліва зараз у перыяд важных дзяржаўных кампаній мы павінны ўзмацніць масава-палітычную работу сярод насельніцтва. Мы павінны ў бліжэйшы час стварыць групы агітатараў у кожным сельсовеце, кіраваць і напраўляць іх работу на выкананне чарговых задач.

Масава-палітычная работа будзе змястоўнай і паспяховай, калі мясцовыя агітатары будуць заўсёды ў курсе важнейшых падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне і за рубяжом. Людзі, якія актыўна праявілі сябе ў барацьбе з нямецкімі захопнікамі павінны стаць асноўным ядром у групах агітатараў.

Трэба прыняць неабходныя захады да шырокага разгортвання палітычнай і культурна-асветнай работы сярод моладзі, актывізаваць дзейнасць комсамола, няўхільна дабіваючыся яго ідэйнага ўплыву на шырокія масы моладзі.

Наша краіна перажывае дні вялікага ўздыму. Аднаўлены свяшчэнныя граніцы Совецкай дзяржавы на поўдні і на поўначы. Набліжаецца светлы дзень поўнага вызвалення Совецкай Прыбалтыкі. Чырвоная Армія набліжаецца да логава фашысцкага звера. Няхай-жа праўдзівае большэвіцкае слова яшчэ больш паскарае рытм працоўнага жыцця, штодзённа натхняе і арганізоўвае совецкіх людзей на новыя подвігі, на ўзмацненне дапамогі фронту для канчатковага разгрому нямецка-фашысцкіх катаў!

## ХЛЕБ—БРЭСЦКІМ ДЫВІЗІЯМ

З вялікім палітычным уздымам сустрэлі сяляне в. Панкі Любішчыцкага сельсовета зварот сялян в. Вычалкі Брэсцкага раёна аб здачы хлеба ў падарунак дывізіям, якія вызвалілі г. Брэст і Брэсцкую вобласць.

На адбыўшымся сходзе сяляне аднадушна пастанавілі даць у падарунак брэсцкім дывізіям 2-3 пуды хлеба з кожнай гаспадаркі.

—Мне 60 год,- заявіў на сходзе селянін Трафімовіч Фама, - але я не гледзячы на сваю старасць буду аддаваць усе сілы на дапамогу фронту. Даю два пуды хлеба ў падарунак брэсцкім дывізіям. Заклікаю усіх сялян наследаваць майму прыкладу.

Выступіўшыя затым Молаш Еўстафій, Высоцкі Іван, Молаш Максім, Высоцкі Грыгорый і другія ўзялі абавязацельства здаць брэсцкім дывізіям не менш па 40-50 кг. хлеба кожны.

Тут-жа, на сходзе сяляне падпісаліся здаць слаўным дывізіям 510 кг. хлеба, 200 кг. бульбы, 500 руб. грошай.

М. Бараноўская.

## У ВЁСЦЫ СКУРАТЫ

З Вялікай радасцю сустрэлі сяляне вёскі Скураты Альшаніцкага сельсовета зварот аб здачы хлеба у падарунак брэсцкім дывізіям.

Сяляне ў адзін голас заявілі: „Дадзім хлеб нашым слаўным вызваліцелям, дапаможам ім хутчэй разграміць праклятага ворага!“.

13 перадавых сялян падпісаліся на 1100 кг. Казімірчык Соня уносіць 50 кг., Мажэйка Дзям‘ян —60 кг. Лушчык Нікалай 50 кг.

Збор хлеба працягваецца.

Шалоніна.

# Ад Совецкага Інформбюро

## З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК ЗА 22 і 23 КАСТРЫЧНІКА.

Войскі Карэльскага фронта, працягваючы наступленне з раёна Петсамо (Печэнга) вышлі на шырокім фронце на дзяржаўную граніцу з Нарвегіяй і захапілі багатыя нікелёвыя руднікі.

Войскі 2-га Украінскага фронта ў выніку імклівага ўдара танкавых злучэнняў і конніцы, 22 кастрычніка авалодалі буйным вузлом камунікацый і важным апорным пунктам на тэрыторыі Венгрыі Нірэдхазе, а таксама занялі гарады і чыгуначныя станцыі ДЭНЕЧЭЙ і КЭПЕЧЭЙ. Данскія і Кубанскія казакі зарубілі да 2000 немцаў.

На паўночны захад і на захад ад гор. Сегед на тэрыторыі Венгрыі нашы войскі авалодалі горадам ІШТУМАЙШЭ.

На тэрыторыі Югаславіі нашы войскі разам з югаслаўскімі часцямі авалодалі гарадамі ТАМГОР, ВЕНА, АГРЭНАВА, ЛАЗАРАВА, КНІЧ.

На працягу 23 кастрычніка войскі Карэльскага фронта, працягваючы наступленне на захад і паўднёвы захад ад гор. ПЕТСАМО, у цяжкіх умовах запалярнага круга, вызвалілі ўвесь раён нікелевага залежу.

Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта ў выніку паспяховага наступлення занялі на тэрыторыі Клайпедскай вобласці больш 500 насялёных пунктаў, сярод якіх буйная чыгуначная станцыя гор. ШЫБЕН. Нашы войскі ачысцілі ўвесь правы бераг ракі Нёман. Ад Клайпедскай вобласці ў праціўніка астаўся порт Клейпеда (Мемель) і некалькі прылягаючых да яго насялёных пунктаў.

Войскі 3-га Беларускага фронта перайшлі ў наступленне і пры падтрымцы масіраваных удараў авіяцыі і артылерыі, прарвалі глыбока эшаланіраваную абарону праціўніка, прыкрываючую подступы да Усходняй Прусіі і, прасунуўшыся ў глыбіню абароны да 30 км і пашырыўшы прарыў на фронту да 140 км., занялі больш 900 насялёных пунктаў, з іх 400 насялёных пунктаў на тэрыторыі Усходняй Прусіі, сярод якіх гарады: ШЫРВІН, ШТАУМПЕНЭТ, ГОЛЬДАФ, СУВАЛЬЦЫ. У гэтых баях знішчана да 4000 нямецкіх салдат і афіцэраў, падбіта 111 танкаў.

На тэрыторыі Югаславіі нашы войскі разам з югаслаўскімі часцямі працягваюць наступленне, занялі некалькі насялёных пунктаў, расшыраюць плацдарм на заходнім беразе ракі Сава.

За 21 і 22 кастрычніка нашымі войскамі на ўсіх франтах падбіта і знішчана 266 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 57 самалётаў праціўніка.

## Масавая здача бульбы

Сяляне вёскі Заполле Белавіцкага сельсовета поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках. 34415 кг. добраякаснага збожжа адпраўлена на склады „Заготзярно.“

Першымі разлічыліся з дзяржавай па здачы збожжа Зайко Іосіф Міхайлавіч, Міхнавец Еўдакія, Здзітавец Люба, Крыштопік Грыгорый, Мізюк Адар'я і другія.

Зараз у вёсцы разгарнулася масавая здача бульбы. Сяляне стараюцца ў сціслы тэрмін разлічыцца з дзяржавай па ўсіх відах паставак.

**Крыштопік М.,** старшыня Белавіцкага сельсовета.

* * *

Сяляне вёскі Панкі Любішчыцкага сельсовета (упаўнаважаны сельсовета Молаш Астап) выканала дзяржаўны план хлебаздачы. Звыш 7 тон добраякаснага зярна паступіла на склады. Акрамя гэтага сяляне вёскі здалі ў фонд абароны 2155 кг. хлеба.

## ТАВАРЫ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Партыя і ўрад праяўляюць вялікія клопаты аб раёнах, вызваленых з нямецкага ярма. Для хутчэйшага аднаўлення народнай гаспадаркі і паляпшэння дабрабыту насельніцтва, у гэтыя раёны завозіцца вялікая колькасць прамысловых тавараў і прадуктаў.

У наш раён ужо завезена тавараў і прадуктаў на 344 тысячы рублёў. З іх 5 тон солі, на 3925 руб. мыла, на 18 тысяч рублёў запалак, многа трыкатажных вырабаў, мануфактуры, абутку гарэлкі і др.

Чакаецца прыбыццё яшчэ вялікай партыі розных тавараў.

Савенкоў, бухгалтар Райспажыўсаюза.

## ПАТРЫЁТКА

Не гледзячы на крывавыя расправы нямецкіх захопнікаў за малейшае падазрэнне ў спачуванні совецкай уладзе, нашы людзі за ўвесь час нямецкай акупацыі захавалі традыцыі вернасці сваёй радзіме.

Сялянка в. Яблонка Пытляк Паўліна Данілаўна зберагла ў час акупацыі чырвоны сцяг Яблонкаўскага сельсовета. З прыходам Чырвонай Арміі патрыётка перадала сцяг сельсовету.

В. а. Рэдактара А. П. РУДОЙ.

## АБ'ЯВА

Прымаецца падпіска на раённую газету „Чырвоная звязда“ на лістапад і снежань месяцы.

Газета выходзіць 8 разоў у месяц.

Надпіска прымаецца ў Косаўскай канторы сувязі, ва ўсіх паштовых аддзяленнях і агенцтвах, а таксама ў паштальёнаў.

Цана надпіскі: на 1 месяц—1р. 30кап. на 2 месяцы—2р. 60 кап.

Цана аднаго нумара 15кап.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага, 10б.